lidskae.by

31.05.2018

# Агульная дыктоўка 2018



Праект ААТ “Лідскае піва”, накіраваны на падтрымку беларускай мовы

«Агульная дыктоўка» – адзін з галоўных карпаратыўных сацыяльных праектаў ААТ «Лідскае піва». Яго ідэя – даць магчымасць кожнаму беларусу праверыць сваё валоданне беларускай мовай і падтрымаць імкненне ўдасканальваць свае веды.

Арганізатары зноў запрашаюць усіх ахвочых **2 чэрвеня у Нацыянальную бібліятэку**, каб напісаць пад дыктоўку тэкст на беларускай мове.

Арганізатары не парушылі традыціі і падрыхтавалі спецыяльны тэкст. У гэтым годзе тэкст будзе прысвечаны 400-годдзю першага беларускага буквара. Чытальнікам праекту выступіць Руся – спявачка, акторка беларускага дубляжу, «голас беларускай чыгункі», трэнерка па голасу .

Тыя, хто не зможа прыехаць у Мінск, таксама змогуць далучыцца і напісаць дыктоўку разам з Мінскам. Для гэтага будзе арганізаваны трансляцыя праз Нацыянальнае радыё і інтэрнет.
Усе тэксты ўдзельнікаў мерапрыемства ў Нацыянальнай бібліятэцы правераць прафесійныя філолагі, а выдатнікі атрымаюць адмысловыя прызы ад арганізатараў.

Уваход вольны, але патрабуецца рэгістрацыя. Форма ніжэй.

***Увага: калі форма запоўнена карэктна, пасля адсылання на экране з'явіцца надпіс "Дзякуем за рэгістрацыю! Мы чакаем Вас 2 чэрвеня ў Нацыянальнай бібліятэцы (правы ўваход з боку рэстарана "Мегаполис", 2 паверх). Збор удзельнікаў – а 11.30 гадзіне. Пачатак дыктанту – 12:20. Жадаем поспехаў!". Пры гэтым не пазней, чым за працоўныя дні, Вы атрымаеце пацверджанне рэгістрацыі на email. Калі гэтага не адбылося ці ў вас з'явіліся цяжкасці з рэгістрацыяй, калі ласка, тэлефануйце па нумары +375-29-646-48-69.***

Да сустрэчы 2 чэрвеня!